На адкрытым сходзе пісьменнікаў ідзе “дыскусія” пра фармалізм у літаратуры. Пачатак ёй даў артыкул М.Горкага ў маскоўскай “Правде”. Усе разумелі, што і артыкул гэты, і “дыскусія” — чарговы сігнал для новых чыстак і арыштаў, якія неўзабаве і пачаліся.

У зале напружаны, прыгнечаны настрой. Пасля пагромных выступаў, казённых артыкулаў Я.Бранштэйна і А.Кучара, падтрыманых А.Александровічам, нясмела выходзілі на трыбуну пісьменнікі і ціха штось няснае гаварылі. Пасля некаторых прамоўцаў былі паўзы, і старшыня сходу М.Клімковіч настойліва паўтараў сваю просьбу: “Хто яшчэ хоча выступіць?”

У часе аднае з такіх замінак падняўся Я.Колас. Павольнай хадой ён дайшоў да трыбуны. Твар ягоны быў усхваляваны. Голас — узбуджаны, глухаваты; інтанацыя — падкрэслена выразная. Ён не чытаў свае прамовы, як некаторыя іншыя (мажліва, не збіраўся і выступаць), а гаварыў — не зусім складна, з перарывамі. Прамова ягоная праз колькі дзён была апублікавана ў газеце “Літаратура і мастацтва”, а пазней — у зборах твораў; але далёка не ў той рэдакцыі, якую я чуў на свае вушы, і ў іншай стылістычнай форме.

Напачатку Я.Колас заявіў, што ён адмоўна ставіцца да гэтай “дыскусіі”, у якой няма “яснасці... і гаворыцца больш кругом ды навокала” і якая сама мае фармалістычны характар. Такое ж уражанне складалася ў яго, калі ён перад тым быў прысутны на такой жа “дыскусіі” ў Маскве. А тады загаварыў канкрэтна, болей-меней так (як я памятаю):

— Ужо чацвёрты вечар мы таўчэм ваду ў ступе. Усё не можам дашукацца фармалізму ў нашай літаратуры. І фармалістычных твораў... А я ведаю такі твор: мая аповесць “Адшчапенец”. Сырая, схематычная, нерэальная. А чаму? Таму, што наша крытыка, а галоўна Бэндэ, з аглобляй у руках бегаў за мною і патрабаваў, каб я як найхутчэй адгукнуўся на калектывізацыю. Дык вось я і адгукнуўся! Цяпер я публічна адмаўляюся ад яе...

У зале мёртвая цішыня. Я.Колас змоўк. Зрабіў крок ад трыбуны, але спыніўся, пастаяў крыху і дадаў (тут ужо я магу зацытаваць паводле публікацыяў, блізкіх да таго, што ён гаварыў):

— Гэта твор не апошні, пра які можна было б шмат пагаварыць... І калі б вы запыталіся ў мяне: “Дзядзька Якуб, якія тыя творы лічыш беззаганнымі?!” — то я крэпка задумаўся б... Можа, каму-небудзь прызнанне гэтае непрыемнае і страшнае, як чалавеку, якому трэба скакаць з трампліна першы раз. Але скокне ён раз, скокне другі, і страх у яго пройдзе...

Цяпер я нават не памятаю, ці выступаў пасля Я.Коласа ў той вечар яшчэ хто. Выступ ягоны так ашаламіў, што заглушыў сабою ўсё іншае, што было на тым сходзе перад ягоным выступам і пасля.

***

У тым жа годзе, дзесь на пачатку кастрычніка, я меў нагоду пазнаёміцца з Я.Коласам. Было гэта ў сувязі з 30-гадовым юбілеем ягонай літаратурнай творчасці. Спаміж розных юбілейных імпрэзаў была рэспубліканская радыёперадача. У студыю радыёстанцыі быў запрошаны юбіляр і прамоўцы ад розных устаноў і арганізацый. Я выступаў там ад настаўнікаў Менска. Усе мы віталі яго перад мікрафонам. Тады Я.Колас пазнаёміўся з усімі намі.

***

Аднойчы ўлетку 1939 г., калі я ўжо працаваў у Народным камісарыяце асветы, мне перадалі незвычайны ліст. Вялікі акруш паперы з двух бакоў быў акуратна спісаны дрыжачай старэчай рукой. Пад лістом подпіс: Адам Багдановіч.

Няўжо гэта ліст ад бацькі Максіма Багдановіча — былога беларускага гісторыка, этнографа, фалькларыста і мовазнаўцы, аднаго з кіраўнікоў партыі “Народная воля” ў Менску ў 1880-х — пачатку 1890-х гг.?

Гляджу на канверт, прыколаты да ліста. Так, сумніву няма: ліст з далёкага Яраслава ад бацькі паэта. У лісце ён не просіць, а моліць дапамагчы яму: мае 77 год; не здольны да ніякае працы; у пару рэвалюцыі згубіў усю сваю маёмасць, ратуючы ад пажару Максімавы рукапісы; а цяпер — амаль што жабрак.

Ад 1928 г. урад БССР выдаваў яму персанальную пенсію. Аднак праз два гады, калі па БССР пакацілася хваля масавых арыштаў 1929—1930 гг. і пачалося “сацыялістычнае наступленне па ўсім фронце”, М.Багдановіч быў абвешчаны “буржуазным” паэтам, вывучэнне ягонай творчасці было выкраслена з усіх школьных праграмаў, а ягоныя “контррэвалюцыйныя” творы забароненыя і выкінутыя з бібліятэк. Тады і ў бацькі паэта адабралі персанальную пенсію. У 1931—1936 гг. ён так-сяк перабіваўся на мізэрнай пенсіі і дапамозе сваякоў. 1937—1939 гг. былі самыя крытычныя, і ён звярнуўся з просьбаю ў Менск.

Што рабіць? Як дапамагчы бацьку М.Багдановіча?

У выніку абмену думкамі з маімі калегамі было вырашана параіцца з Саюзам пісьменнікаў БССР і Акадэміяй навук; асабіста — з М.Лынькоўвым, тады старшынёю СП, і Я.Коласам, віцэ-прэзідэнтам АН. Імя паэта да таго часу было зноў “рэабілітаванае”, а бацька ягоны мае вялікія заслугі перад беларускім народам: жывучы далёка ад Бацькаўшчыны, ён узгадаваў сына на беларускага паэта, захаваў і перадаў Беларусі асноўны фонд ягонай спадчыны — архіў рукапісаў.

У той жа дзень я паехаў да М.Лынькова, які прыхільна паставіўся да гэтай справы, а ад яго — да Я.Коласа.

Я.Коласа я застаў у ягоным кабінеце. Ён выслухаў мяне, папрасіў ліст А.Багдановіча, перачытаў яго. Узяў пяро і выпісаў у свой настольны блакнот адрас.

— Трэба неадкладна дапамагчы старому. Каб не было запозна... — І Я.Колас выказаў свае меркаванні, як дапамагчы. Пасля таго працягваў:

— Самога Максіма я не ведаў. А бацьку яго добра памятаю. Улетку 1923 г. ён прыязджаў у Менск. У Інбелкульт прывозіў Максімавы рукапісы, фатаграфіі з сямейнага альбома і напісанаю ім самім, на просьбу Інбелкульта, падрабязную біяграфію сына. На той час не прыпадала ніякая юбілейная дата, звязаная з М.Багдановічам, але Інбелкульт вырашыў з прычыны прыезду бацькі зрабіць літаратурны вечар (ён адбыўся 16 чэрвеня — гл.справаздачу аб ім у газ. “Савецкая Беларусь”, №137 за 20.VI.1923 г. — **Заўв. аўтара**). Здаецца, то быў наогул першы такі вечар у памяць М.Багдановіча. З дакладамі і ўспамінамі выступалі Піятуховіч, Бядуля, Грамыка...

Перавёўшы гутарку на М.Багдановіча, ён казаў:

— Максім Багдановіч быў не толькі выдатны паэт, але і крытык.

Я.Колас высунуў адну з бакавых шуфлядаў у сваім стале і выцягнуў адтуль другі том акадэмічнага Збору твораў М.Багдановіча.

— Нядаўна на пленуме Саюза пісьменнікаў у Кіеве, прысвечаным 125-годдзю з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі, я рабіў даклад. Рыхтуючыся да яго, я перагледзеў гэты том і здзівіўся, які глыбокі і высокакультурны крытык быў М.Багдановіч. У дакладзе я зачытаў выпісаны адсюль аналіз Шаўчэнкавага верша.

Я.Колас адгарнуў кнігу і паказаў мне артыкул “Краса і сіла”, перадрукаваны з часопіса “Украинская Жизнь”, які па-расейску ў Маскве выдаваў С.Пятлюра (М.Багдановіч быў сталым супрацоўнікам таго часопіса).

— Калі я скончыў даклад, да мяне падыходзілі і пыталіся: “Няўжо вы да рэвалюцыі мелі такога крытыка?”

Наступнага дня я выслаў А.Багдановічу ліст, у якім падрабязна паведамляў яму пра нашыя захады.

...Хутка пасля таго на супольнае хадайніцтва Наркамасветы, Саюза пісьменнікаў і Акадэміі навук яму была прызначана персанальная пенсія. На жаль, бедны бацька геніяльнага паэта пакарыстацца ёю ўжо амаль не меў часу: яшчэ ў лютым 1940 г. Я.Колас і я атрымалі ад яго лісты, а ўжо 16 красавіка ён памёр. У лісце да Я.Коласа А.Багдановіч пісаў: “Ваша рэдкая спагадлівасць і Наркамасветы БССР мне глыбока кранулі. Шлю сардэчную ўдзячнасць Вам асабіста і прашу Вас перадаць маю ўдзячнасць у Камісарыят асветы кансультанту-метадысту па беларускай мове т.Калубовічу” (гэты ліст А.Багдановіча да Я.Коласа ад 5 лютага 1940 г. апублікаваны ў кнізе “Шлях паэта. Зборнік успамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра Максіма Багдановіча”. Складальнік Н.Б.Ватацы. Мінск, “Мастацкая літаратура”, 1975, стар.172. — **Заўв.аўтара**).

***

У канцы лістапада 1939 г. аддзел культуры ЦК КП(б)Б склікаў нараду, на якую былі запрошаныя філолагі Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук, пісьменнікі, прадстаўнікі Наркамасветы і выдавецтва. Нарада, згодна з запросінамі, павінна была “выказацца ў паўстаўшых праблемах беларускай мовы і правапісу”. Праблемы гэтыя сапраўды паўставалі і абвастраліся пасля русіфікацыйнай рэформы правапісу ў 1933 г., выклікаючы ў практыцы друку і пісьма штораз большы разнабой, супярэчлівасці і канфлікты.

Канкрэтнай зачэпкай да нарады была, праўдападобна, дыскусія, якая ў пытаннях мовы зноў разгарэлася ў тыя дні паміж газетамі “Літаратура і мастацтва” і “Звязда”. Для валадароў Беларусі дыскусія была дужа не на руку, асабліва беручы на ўвагу толькі што “вызваленую ад польскага нацыянальнага прыгнёту” Заходнюю Беларусь. “Вызвольная” прапаганда была ў самым разгары, а тут прыкры дысананс! Загадаць змоўкнуць, прыкрыкнуць, як гэта перад тым звычайна практыкавалася, у тых акалічнасцях, відаць, уважалася за немэтазгоднае. Зноў жа, праз Заходнюю Беларусь былі крышачку прыадчыненыя дзверы ў вольны свет, а ну ж пачуюць і там.

Калі я збіраўся ехаць на тую нараду, да мяне па дарозе з педагагічнага інстытута, дзе ён чытаў лекцыі, зайшоў навуковы сакратар Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук дацэнт Кастусь Гурскі. Разам мы і паехалі. У думках нашых цяплілася, хоць і невялікая, надзея. Набалелае пытанне, прынамсі, пастаўлена на парадак дня.

У вестыбюлі ЦК дзяжурны міліцыянер, перад якім на стале ляжаў спіс запрошаных на нараду, выпісаў нам пропускі і растлумачыў, як знайсці патрэбны пакой. Але тут расчыніліся дзверы з вуліцы і на парозе паказаўся Я.Колас. К.Гурскі пацягнуў мяне за рукаў, і мы адступілі назад, да акна вестыбюля.

Я.Колас заўважыў нас і падышоў. Прывітаўшыся, ён адразу звярнуўся да К.Гурскага:

— Я чуў, што ў Інстытут літаратуры і мовы званілі Папкоў (сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР) і Грэкава (сакратар ЦК КП(б)Б), але не меў выпадку папытацца ў Вас. У якой справе яны званілі?

К.Гурскі паўтарыў Я.Коласу ўжо расказаныя мне па дарозе сюды новыя, не толькі абуральныя, але і анекдатычныя выпадкі з праблемы, якая пастаўлена на парадак дня сённяшняй нарады. Яны званілі, казаў ён, каб узаконіць навуковым аўтарытэтам інстытута тыя змены ў правапісе, якія яны ўжо загадалі ўвесці ў практыку газеты “Звязда”. Папкоў — замену “е” на “і” ў слове “Менск”, якое “Звязда” так ужо і набірае; бо, паводле яго, гэта імя аднае з рэспубліканскіх сталіцаў “нашае краіны”, і яно ўсюды павінна пісацца адноўкава; і напісанне слова “вобласць” без прыстаўнога “в”, з ім гэта слова “рэжа вуха”, як бы яно — ад “вобла”...

— А што ж Вы яму адказалі? — перабіў К.Гурскага Я.Колас.

К.Гурскі адказаў, што яму цяжка было згадзіцца з такімі аргументамі; што, калі правапіс абаперці на такую “этымалогію”, то знойдзецца шмат іншых выпадкаў і слоў, у якіх трэба было б рабіць якіясь аперацыі, і прывёў Папкову прыклад: “камсамол” — ад “камса”...

— Ну а Грэкава? — зноў перапыніў яго Я.Колас. Відаць было, што ён спяшаўся.

Грэкава, працягваў К.Гурскі, загадала ўнесці ў правапіс дзве зробленыя ёю “папраўкі” ў лозунг “Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!”. Папершае, слова “злучайцеся” замяніць на “яднайцеся”, бо вось яна як сакратар ЦК часта падпісвае “дырэктывы” калгасам, што ўжо пара пачынаць “злучную кампанію для ската”; таму заклік “злучайцеся!” у дачыненні да пралетарыяту “неяк нядобра гучыць”. Па-другое, у слове “яднайцеся” пачатковае “я”, хоць і стаіць у першым складзе перад націскам, павінна пісацца праз “е”; бо могуць быць выпадкі, тлумачыла Грэкава, калі слова гэта пры пісьме ці друку трэба пераносіць і тады пры падзеле яго можа выйсці “яд-”. Для палітычнага лозунга гэта недапушчальна, ЦК партыі на гэта не можа згадзіцца.

Я.Колас нічога не адказаў. У вестыбюль увайшлі К.Крапіва і П.Глебка. Ён далучыўся да іх, а мы пайшлі на другі паверх. У невялікай зале ўжо сядзела да 40 асобаў.

Нараду адчкрыў У.Малін, сакратар ЦК. Пасля яго гаварыў Я.Колас. Як заўсёды ў такіх выпадках, сур’ёзны, заклапочаны і пачуццёвы. У руках ён трымаў экземпляр газеты “Звязда”.

Гэтая ягоная прамова ніколі не была друкаваная. Мажліва, дзеля таго, што ў ёй Я.Колас не толькі выказваў патрэбу перагледзець і выправіць правапіс, але востра крытыкаваў “моўную практыку” газет, а галоўнае “Звязды”, якая, паводле яго, паглыбляла “правапісны хаос”.

— Іншыя газеты і часопісы, а асабліва выдавецтва, дзе заўсёды шмат набранага, — казаў ён, — “Звязда” проста збівае з панталыку. І яны не ведаюць, як жа, урэшце, набіраць і выпраўляць карэктуру — ці згодна з існуючым правапісам, ці так, як у “Звяздзе”... Тое самае трэба сказаць і аб спробах “Звязды” ўвесці ў норму беларускай літаратурнай мовы без усялякае патрэбы і нат супраць натуральных законаў беларускай мовы некаторыя расейскія словы ў збеларушчанай форме. Нядаўна мы чыталі ў ёй справаздачу пра кастрычніцкія святы ў Менску. Там пісалася, што ў зале опернага тэатра адбылося “таржэсцвеннае” пасяджэнне. Чаму “таржэсцвеннае”, — высока ўзнялася рука Я.Коласа са “Звяздою” — калі мы маем добрае беларускае слова “ўрачыстае”? Але калі ўжо “таржэсцвеннае”, то чаму тады не “засяданне”?

Ён прасіў перагледзець правапіс і не “нявечыць беларускае мовы”.

На выступе Я.Коласа “дыскусія” была перарваная. З бакавых дзвярэй нечакана выйшаў першы сакратар ЦК П.Панамарэнка і пачаў расказваць, як колькі дзён перад тым ён быў у Беластоку, як у гатэль да яго быў выкліканы цырульнік, як той цырульнік яго галіў, і падрабязна пра сваю дыскусію з ім аб характары савецкай улады. На тым нарада і скончылася.

***

Быў звычайны рабочы дзень у канцы снежня 1939 г. Зазваніў тэлефон. Я зняў слухаўку.

— Гаворыць Колас. Я даведаўся, што Вы едзеце на раённую настаўніцкую канферэнцыю ў Стоўбцы. Ці не былі б Вы ласкавымі, перад тым, як паедзеце, а хоць бы і сёння пасля працы, заехаць да мяне дадому? Я маю пільную патрэбу ў гэтым.

Не згадзіцца я не мог, і мы ўмовіліся, што я прыеду сёння ж.

Пасля працы я сеў у трамвай, што ішоў Савецкай вуліцай, мінуў Эльвод, мост праз р.Свіслач і на Шпітальнай выйшаў. Ужо пачало змяркацца, але ісці было недалёка. Праз колькі хвілін ля гарадскога парку на 2-м Шпітальным завулку я спыніўся перад двухпавярховым драўляным асабняком. Гэта быў уласны дом Я.Коласа. У 1920-х гг. у гэтым зялёным куточку горада ў суседстве жылі Я.Лёсік, б.прэзідэнт БНР д-р І.Серада, М.Грамыка, адзін час М.Гарэцкі і шмат іншых. Усе яны павысыланыя. Застаўся тут адзін Я.Колас.

Калі я ўвайшоў у двор, Я.Колас калоў дровы. Ён паклаў сякеру, прывітаўся і павёў мяне ў хату. Па дарозе ў ягоную бібліятэку мы спаткалі жонку, і ён пазнаёміў мяне з ёю.

У бібліятэцы мы селі на канапу, і Я.Колас вытлумачыў мне сваю просьбу:

— Я маю лісты з Мікалаеўшчыны, дзе не быў ад 1915 года. Запрашаюць у госці, а я ўсё яшчэ ніяк не змог адведаць іх, хоць і думкамі ўвесь там. То адно, то другое стаіць на перашкодзе... А яшчэ яны просяць падручнікаў для школы і маіх кніг. Дык вось, даведаўшыся, што Вы едзеце ў Стоўбцы, я і вырашыў прасіць Вас завезці ім ад мяне пакуначак з кнігамі. Сёння я абегаў кнігарні і тое-сёе (праўда, мала) назбіраў.

Жэстам рукі ён паказаў на крэсла, якое стаяла пры ягоным рабочым стале. На крэсле ўзвышаўся стажок да 20 кніг. Я.Колас устаў і прапанаваў мне падысці разам з ім да тых кніг. Ён браў кожную з іх, называў, што гэта за кніга, і клаў на стол. Першыя ішлі падручнікі. Калі ж дайшоў да сваіх кніг, то хутка перакладваў дзіцячыя — “Дзед і мядзведзь”, “Савось-распуснік”, “Раквусач”, тады — “Новую зямлю”, “Сымона-музыку”, “Дрыгву”... Але вось на зборніку вершаў “Нашы дні” запыніўся, пакруціў яго ў руках, падумаў і адклаў убок.

Мы звязалі ўсе кнігі шпагатам, уклаўшы ў сярэдзіну верхняй кнігі ліст Я.Коласа ў незаклееным канверце. Я.Колас вывеў мяне на вуліцу, развітаўся і папрасіў, каб па прыездзе са Стоўбцаў я абавязкова пазваніў да яго — у акадэмію ці дадому.

...Праз колькі дзён (хутчэй за ўсё — 3 студзеня 1940 г., бо Новы год я спатыкаў у Стоўбцах) я пазваніў Я.Коласу. Паведаміў яму, што ўжо вярнуўся назад і прывёз яму пачку з мікалаеўскім салам і каўбасою.

Я.Колас сказаў:

— То я Вам проста загадваю: адразу пасля працы, без аніякіх перасадак, да мяне дадому. У нас і павячэраем.

На гэты раз мы размясціліся ў сталовай. Пакуль жонка смажыла мікалаеўскую каўбасу і сала, Я.Колас чытаў два лісты, прывезеныя мною, разам з пачкам — ад сваякоў і ад старога сябра, Базыля Шчорса. Тады папрасіў падрабязна расказаць пра ўсё падарожжа ў Стоўбцы і пра спатканні там. Найбольш яго зацікавіла спатканне на канферэнцыі з братам ягоным Міхасём і адведзіны м. Новы Свержань, куды я быў запрошаны ад Шчорсаў.

Памятаю, што загадчык райана Хількевіч, перш чым заехаць да Шчорсаў, хацеў пры выпадку паказаць мне Новасвержаньскую школу. Таму, калі балагол пад’ехаў да райана і мы ўселіся ў вазок, ён коратка сказаў: “У Новы Свержань, да школы”.

Хвілінаў праз дваццаць мы ўехалі ў мястэчка. Трохі праехалі па ім, і каля аднаго будынка балагол спыніў каня. Здзіўлены Хількевіч агледзеўся па баках і выпаліў: “Куды ж ты нас прывёз? Гэта ж сінагога!” Балагол спакойна павярнуўся да нас і адказаў: “Вы ж прасілі — да школы”. Але тут жа спахваціўся і зразумеў сваю памылку. Завярнуў каня назад, зрабіў колькі паваротаў і на іншай вуліцы зноў затрымаў каня. Агледзеўшы школу, мы заехалі да Шчорсаў, дом якіх стаяў на самым краі мястэчка пры дарозе ў Стоўбцы.

Я.Колас шчыра смяяўся з гэтае прыгоды, увесь ажывіўся, наогул перарываў мой расказ пытаннямі, рабіў каментарыі і ўстаўкі са сваіх успамінаў. Потым выйшаў са сталовай, вярнуўся назад з кніжкаю і пачаў чытаць:

— “У мястэчку Панямонь многа розных выдатных будынкаў і ўстаноў. Тут ёсць... царква Св.Магдалены... дзве школы, сінагога, касцёл і камяніца Базыля Трайчанскага. Але вы яго, напэўна, не ўсе ведаеце. А шкада: чалавек ён нішто сабе, настаўнік і грамадскі дзеяч...”

— Дык жа ж Панямонь, — спыніўся чытаць ён аповесць “У глыбі Палесся”, — гэта і ёсць Новы Свержань; а Базыль Трайчанскі і яго камяніца — Базыль Шчорс і яго дом. У доме тым я не раз бываў...

Ніякае ваўражэнне тады не магло дапусціць, што прататыпа гэтага персанажа з Коласавай аповесці праз восем год мы будзем хаваць на эміграцыі (на нямецкім могільніку ў Каме).

Пад канец вячэры настрой, аднак, змяніўся на сумны. Жонка Я.Коласа нават праслязілася, расказваючы, што ейнага брата, Камінскага, дзесь на Лідчыне арыштавала НКВД і яны нічога не ведаюць пра ягоны лёс. А Я.Колас з сумам дадаў:

— Ягоная атрымаў нядаўна ліст ад жонкі Уласава, былога рэдактара газеты “Наша ніва”. Яна паведаміла, што Уласаў арыштаваны, і прасіла заступіцца за яго.

Некалі А.Уласаў быў актыўным беларускім публіцыстам і палітычным дзеячам — адным з ініцыятараў заснавання Беларускай Сацыялістычнай Грамады ў 1902 годзе, рэдактарам газеты “Наша ніва” і часопіса “Саха”, сябрам Рады БНР і ейнага прэзідыума, сенатарам Заходняй Беларусі ў Польскім сойме. У пазнейшым часе і ў часе арышту, будучы ўжо ў гадах і з слабым здароўем, стаяў у баку ад публічнага жыцця і ва ўласным фальварку пад Маладзечнам дажываў свой век.

— Мы з Купалам, — далей казаў Я.Колас, — хадзілі да Панамарэнкі. Прасілі за яго. Але Панамарэнка нам не дапамог. Ён быццам бы званіў у НКВД, скуль яму адказалі, што Уласава ў БССР ужо няма. Таму ён нічога не можа зрабіць.

***

Рух за выпраўленне беларускага правапісу і за чысціню мовы ніколі не сціхаў ад часу правапіснае рэформы 1933 г. Праўда, быў ён мо заціхі, нясмелы. Паўсюдна выяўляўся болей у прыватных гутарках. Але скаргі, нараканні і галасы крытыкі часам узнімаліся на настаўніцкіх сходах, у кабінетах навуковых інстытуцыяў ці ў фельетонах газеты “Літаратура і мастацтва”. Цяпер, у новых, больш спрыяльных акалічнасцях рух гэты пасмялеў і ледзь не выліўся ў бунт. Усё гэта прывяло да таго, што спецыяльнай пастановай СНК БССР для перагляду правапісу была пакліканая Правапісная камісія. Мне цяжка назваць дакладную дату, калі гэта было, але думаю, што дзесь увесну 1940 г.

У склад камісіі ўвайшлі: ад Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук — ягоныя дырэктар і навуковы сакратар В.Барысенка і К.Гурскі; ад Саюза пісьменнікаў — Я.Колас, Я.Купала, К.Крапіва, М.Лынькоў, П.Глебка і М.Клімковіч; ад Наркамасветы — кансультанты-метадысты па беларускай мове і літаратуры Гарачун і я. Старшыня камісіі — наркам асветы Е.Уралава; у ейным кабінеце камісія і збіралася на свае сходы.

На першым сходзе ішла агульная дыскусія: у якім кірунку рабіць змены, на якія арфаграфічныя прынцыпы абаперці іх. Думкі сяброў камісіі падзяліліся.

М.Клімковіч выказаўся ісці па той самай дарозе, на якую сталі аўтары рэформы ў 1933 г., гэта значыць узмацніць марфалагічны прынцып. Паводле яго, такія рысы беларускай мовы, як аканне, дзеканне і цеканне, зусім не павінны перадавацца на пісьме. Супрацьлеглы погляд выказаў Я.Колас. Ён горача адстойваў пераважнасць фанетычнага прынцыпу, які найбольш адказвае асаблівасцям беларускай мовы; настойваў узмацніць перадачу на пісьме акання, як гэта было да рэформы 1933 г. У канцы заявіў, што гэта не толькі ягоны пункт гледжання, але і Я.Купалы, які дзеля адсутнасці ўпаважніў яго на гэтую заяву.

Калі ўсе сябры камісіі выказаліся, выяснілася, што М.Клімковіча ніхто не падтрымаў. В.Барысенка і М.Лынькоў не занялі ніякае пазіцыі, а ўсе іншыя сябры сталі на бок Я.Коласа. Е.Уралава ў дыскусіях удзелу не брала, яна кіравала працаю камісіі і вяла сходы.

...Так злажылася, што мне выпала ехаць да Я.Купалы, каб ён падпісаў пратакол сходу камісіі. Я быў шчаслівы выпадку. Я.Купалу я шмат разоў бачыў і чуў, але мне не здаралася быць блізка да яго, каго я ўважаў за нацыянальнага правадыра. Дый ці толькі я. Я бачыў, як усе, а ў тым ліку нават і Я.Колас, пры кожнай нагодзе падкрэслівалі ягонае першынство. Я не сумняваўся, што і сам Я.Купала гэта разумеў. Ніхто з беларускіх пісьменнікаў не захоўваўся так незалежна, як Я.Купала, хоць гэта было і не так лёгка, ён сам дакараў сабе, што таксама

...Плечы гнуў у крук не раз;
Не йшоў з адкрытымі вачыма ў свет
І сцежкі не прастаў,
А ўсёй магчымасцю магчымай
Таптаў сляды, сябе таптаў.

Перад тым як ехаць да Я.Купалы, я пазваніў. Жонка ягоная, цётка Уладзя, адказала: “Янка дома. Едзьце”. І вось я на Садовай вуліцы. Заходжу ў двор з таполяй і садком. З якімсь хваляваннем падыходжу да дзвярэй.

У пярэднім пакоі мяне спатыкае цётка Уладзя.

— Янка — там. Ён чакае Вас, — і прыадчыніла мне дзверы ў гасціную.

Калі я праходзіў праз пярэдні пакой, я заўважыў Купалаву маці, Бянігну. Яна сядзела ў баку ад праходу з Кацярынаю — дачкою аднае з “раскулачаных” Купалавых сясцёр. Кацярына працуе ў 2-м Клінічным гарадку сястрою і, як і паэтава маці, жыве ў Купалаў.

Я.Купала спаткаў мяне сардэчна. Твар ягоны свяціўся прыемнай усмешкай, увесь ён быў ветлівы, далікатны, уважлівы і разам з тым просты, даступны; наогул быў у добрым настроі і жартаваў. Ён ведаў, па якой справе я прыехаў, падвёў мяне да стала, падпісаў пратакол і сказаў:

— Мне трохі нездаровіцца. То я і прасіў Коласа, каб ён выступаў там і за мяне. Ён расказвае мне пра сходы камісіі.

Мой візіт да Я.Купалы быў напярэдадні юбілейных урачыстасцяў 35-годдзя ягонай паэтычнай творчасці. Усе тыя дні Я.Купала атрымліваў віншавальныя тэлеграмы і падарункі. Таму, калі мы сядзелі і гутарылі, цётка Уладзя і Кацярына ўнеслі ў гасціную толькі што прывезены з пошты і ўжо раскрыты пачак-падарунак Я.Купалу ад ягонага старога прыяцеля, вядомага ў СССР мастака К.Ялісеева, былога на пачатку 1920-х гг. дэкаратара Беларускага дзяржаўнага тэатра ў Менску. Калі з пачка выцягнулі абраз у раме — на палатне стаялі жывыя палескія хвоі. Другі падарунак ад іншага маляра (не памятаю — якога) вісеў ужо на сцяне, над канапаю, на якой мы сядзелі. Гэта быў алейны партрэт Я.Купалы, у кунтушы з палосамі.

Хутка дзверы зноў адчыніліся, і цётка Уладзя сказала:

— Янка, да цябе тут яшчэ адзін інтэрэсант.

У гасціную ўвайшоў хлопчык гадоў 15-ці. Я ўстаў, каб развітацца, але Я.Купала затрымаў мяне.

Хлопчык назваўся, што ён кур’ер з рэдакцыі менскай польскай газеты “Sztandar Wolnosci”. Ён прынёс, як гэта зараз жа выявілася, уступны артыкул да выдання вершаў і баладаў А.Міцкевіча. Артыкул гэты (колькі аркушаў машынапісу) Я.Купала павінен быў тут падпісаць. Але перад тым ён зацікавіўся самім хлопчыкам і пачаў ставіць яму пытанне за пытаннем:

— А чаму ж ты працуеш кур’ерам? Хіба ты не вучышся ў школе?

Хлопчык адказаў, што ён вучыцца ў 8-м класе сярэдняй школы, але што мусіць плаціць за навуку, а маці не мае чым. Таму зрана ён на лекцыях у школе, а па абедзе “падрабляе грошы” (у тым часе была ўведзена плата за навуку ў 8—10 класах і ў вышэйшай школе).

— А скуль жа ты, хлопча?

— З Койданава.

— З Койданава? Я ведаю там шмат каго. Чый жа ты будзеш?

Той адказаў, і гутарка пайшла далей. Відаць было, што Я.Купала пашкадаваў беднага хлопчыка ды яшчэ і земляка. Ён папрасіў цётку Уладзю прынесці яблыкі, і яны ўдваіх тут жа паўкладалі іх у кішэні хлопчыка. Толькі тады Я.Купала сеў да стала, павольна палажыў акуляры, адгарнуў апошні аркуш артыкула і хацеў падпісаць. Ды пяро, відаць, ужо не мела чарніла, і ён звярнуўся да жонкі:

— Уладзя, дай мне, калі ласка, іншую асадку.

Цётка Уладзя заўважыла:

— А што ж ты падпісваць будзеш? Ты чытаў, што там напісана? А мо там табе смяротны прысуд?

— А навошта ж ты ў мяне? Ты і чытай! Мая справа — падпісваць, — з жартам адказаў Я.Купала.

І ён, не чытаючы, узяў з рук жонкі асадку і падпісаўся. Я падумаў тады, як трэба будзе ў будучыні быць асцярожным з публіцыстыкай Я.Купалы. У тыя змрочныя гады ён мог падпісаць тэкст, які не толькі не выказваў ягоных паглядаў, але нават і не быў чытаны ім. Імя паэта было вялікае, і ім злоўжывалі.

* * *

На другі дзень вайны я выйшаў з 21-й сярэдняй школы, якая стаяла на рагу Савецкай і Пралетарскай вуліцаў. Неспадзявана насустрач мне — Я.Купала. З апушчанай галавою. І з неразлучнай палкаю-крывулькаю. Вочы — стомленыя, засмучаныя. Ён прыстаў мо толькі на хвілінку. Кудысь спяшаўся з дому.

Мне здалося, што ён не гаварыў, а ціха скардзіўся. Толькі што вярнуўся з Рыгі, куды ездзіў на з’езд пісьменнікаў Латвіі. Па дарозе дадому затрымаўся ў Вільні, дзе да гатэля, у якім ён спыніўся (з ім былі таксама М.Лынькоў і П.Броўка), прыйшла дэлегацыя віленскіх беларусаў, але сакратар ЦК Ц.Гарбуноў, які ўсю дарогу іх суправаджаў, дэлегацыю не дапусціў.

Я.Купала быў ужо паранены гэтым выпадкам. З Менска збіраўся ехаць на сваю дачу ў Ляўкі.

Калі ён адышоў, я яшчэ колькі часінаў стаяў, праважаючы яго вачыма. Я бачыў, як ён мінуў педагагічны тэхнікум, дзе ў 20-х гг. працаваў Я.Колас, і крута на пад’ёме вуліцы пачаў падымацца ўгору, насустрач нерухомым слупам чорнага дыму, што стаялі над загарадным аэрадромам. Ужо пазней я не раз думаў: была якаясь таямнічая сувязь паміж тымі слупамі чорнага дыму і хуткай пасля таго трагічнай смерцю Я.Купалы.

* * *

Ад тых часоў ужо шмат разоў ападала лісце з дрэваў... І Я.Купала, і Я.Колас даўно памерлі. Але мне думаецца, што іхняя смерць — гэта толькі пачатак іхняй несмяротнасці.

ДАСЛЕДАВАННІ

Генетыкі пацвердзілі, што беларусы — еўрапейская нацыя

Навукоўцы з Інстытута генетыкі і цыталогіі Акадэміі навук правялі даследаванні малекул ДНК, узятых у добраахвотнікаў па ўсёй краіне. Вынікі эксперыменту дазваляюць не проста намаляваць генны партрэт беларусаў, але і абвергнуць некаторыя тэорыі пра паходжанне беларускага этнасу.

"Большасць еўрапейскіх народаў, як вядома, выйшлі ад старажытнай галіны індаеўрапейцаў, і беларусы тут не выключэнне. Але доўгі час Беларусь заставалася чорнай плямай на генетычнай мапе Еўропы. Існавалі і існуюць розныя гіпотэзы аб нашым паходжанні. І практычна ўсе яны маюць заганы, гэта значыць не ўлічваюць цалкам усіх акалічнасцяў засялення тэрыторыі Беларусі ў пасляледніковы перыяд. Аднак вырашаць гэтыя супярэчнасці — справа гісторыкаў. Мы ж ставілі іншую мэту: на падставе аналізаў мужчынскіх і жаночых храмасом, узятых у 1000 сельскіх жыхароў (менавіта яны з'яўляюцца ў большай ступені носьбітамі генатыпу беларусаў, а не гараджане) выявіць пэўныя падобнасці і адрозненні нашых суайчыннікаў у параўнанні з іншымі народамі. Вынікі гэтых аналізаў дазваляюць нам зрабіць выснову пра тое, што генетычная агульнасць людзей, што жывуць на нашай зямлі, пачала фарміравацца яшчэ ў каменным веку. Таму мы — прамыя нашчадкі славянскай галіны індаеўрапейцаў", — сказаў у інтэрв'ю "Вечернему Бресту" кіраўнік праекта, прафесар, доктар біялагічных навук Алег Давыдзенка.

Паводле слоў Давыдзенкі, рэгіянальных адрозненняў паміж, напрыклад, заходнімі і ўсходнімі беларусамі заўважана няшмат: *"Адрозненні ёсць, але яны невялікія. Натуральна, у сілу пэўнага ўплыву, які аказвалі на нас суседнія народы: палякі, яўрэі, украінцы і г.д. Але вялікіх адрозненняў паміж беларусам, што жыве, напрыклад, на Брэстчыне, і жыхаром Магілёўшчыны не назіраецца. Канешне, нейкія асаблівасці можна вылучыць у плане традыцый, абрадаў, дыялектаў. (...) Але ўсё гэта не з'яўляецца вызначальным для генетычнай самаідэнтыфікацыі па нацыянальнай прыкмеце"*.

"Мы — чыстакроўныя еўрапейцы, якія адносяцца да ўсходнеславянскай групы", — зазначыў А.Давыдзенка.

ЧУЛІ?

Эканомяць не на ўсіх

Узбраенне Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі папоўніцца паліцэйскім верталётам французскай вытворчасці — "Еўракоптэрам".

Паводле меркавання кіраўніка дэпартамента фінансаў і тылу МУС Віктара Мельнікава, гэта адзін з самых сучасных апаратаў, які выкарыстоўваюць праваахоўнікі еўрапейскіх краін.

ГАРДЕРОБ

Без чего не обойтись модницам этой осенью и зимой?

1. Свитер с высоким воротником

Высокий ворот заслужил признание как классический вариант. Свитер с высоким воротником, классическое решение, очень выигрывающее из-за возможности продемонстрировать красивые ожерелья, браслеты или просто красивое, свежее лицо.

2. Черная юбка-карандаш

Все модные критики хором отмечают, что в нынешнем сезоне мода "повзрослела", стала более серьезной, сдержанной и консервативной. И юбки-карандаши теперь празднуют настоящий триумф.

3. Шерстяные брюки

Очередная "взрослая" и элегантная вещь, которая вполне может задержаться в вашем гардеробе надолго, — это широкие брюки. Талия этой зимой наконец окончательно воцарилась на своем законном месте, а порой даже поднимается еще выше.

4. Белая рубашка

Да, для некоторых это звучит просто и даже скучно, но отглаженная белая рубашка с длинным рукавом — одна из основ осеннего гардероба.

Даже у такой стандартной вещи найдется немало вариантов: хлопок со стрейчем, свободный или облегающий силуэт, детали рукавов и воротника. Все эти варианты отлично смотрятся как под пиджаком или кардиганом, так и отдельно, в сочетании с широкими брюками или юбкой.

5. Косынка и берет

Косынки, повязанные "аля бабушка", и береты — хит осенне-зимнего сезона.

6. Кашемировый палантин

Это единственный вид накидки, который можно использовать в качестве изысканного одеяла в самолете и носить как с джинсами, так и с маленьким черным платьем. Это не просто стильная и практичная вещь, это Вещь с большой буквы.

7. Высокие ботинки

Ботинки с голенищами до колен действительно имеют смысл осенью, потому что они одинаково греют и в узких джинсах, и в мини-юбке, позволяя ненадолго продлить лето. Если вы молоды (возрастом или душой), носите высокие сапоги, заправляя в них узкие брюки. Если вы предпочитаете юбки, заправляйте в сапоги леггинсы для сохранения тепла.

Чтобы выиграть в сочетании моды и комфорта, выбирайте каблуки высотой около 5 сантиметров.

8. Длинные перчатки

Последний штрих к образу — перчатки. В этом году они длинные, чаще всего по локоть.

9. Жемчуг, крупная бижутерия

Само слово "жемчуг" невероятно созвучно со словом "женственный" — и поэтому жемчуг стал прекрасным дополнением многих модных нарядов этой осенью. Серый жемчуг на белой рубашке в сочетании с черными широкими брюками — и вы успешная бизнес-леди; а вечером платье-футляр, украшенное нитями кремового жемчуга, станет незаменимым нарядом для коктейля.

10. Большая кожаная сумка

Чем холоднее погода, тем больше становятся модные сумки: ведь осенью вам приходится брать с собой не только помаду и мобильный телефон, но и зонтик, шарф, перчатки, головной убор. "Кожаная сумка — не значит скучная сумка", — такое заявление содержится в коллекциях многих брендов. Логотипы и экзотическая кожа, яркие цвета и блестящая металлическая фурнитура, узелки и многое, многое другое — все это создано, чтобы сделать образы ярче. Но для настоящих леди есть немало сумок, выполненных в классическом стиле. Их простая прямоугольная форма заключает в себе невысказанный шик.

СТАЛІЦА

Захар Шыбека раздае аўтографы.

Адноўлены летапіс

Падарунак Мінску ад Захара Шыбекі

Вядомы гісторык, доктар гістарычных навук Захар Васільевіч Шыбека прэзентаваў 940-гадоваму юбіляру Мінску трэцяе выданне найпапулярнейшага гістарычнага бестселера "Мінск сто гадоў таму". Урачыстая сустрэча аўтара з чытачамі адбылася ў Музеі гісторыі і культуры Беларусі.

Даведка "НВ": "Минск. Страницы жизни дореволюционного города" — так называлася першае выданне кнігі Захара Шыбекі, у якой была адлюстравана гісторыя беларускай сталіцы. Убачыла яна свет у 1990 годзе. Другое выданне, ужо перакладзенае на беларускую мову і дапрацаванае, з'явілася ў кнігарнях у 1994-м. Абедзве кнігі разышліся тыражом па 15 тысяч экземпляраў (як сапраўдны бестселер) і да гэтага часу могуць лічыцца адным з самых поўных навукова-папулярных выданняў аб нашым горадзе.

Прэзентацыя праходзіла ва ўтульнай, але вельмі цеснай, прасторы выставачнай залы Музея гісторыі і культуры Беларусі. Публіка заняла месцы для сядзення, шмат людзей стаялі і тоўпіліся ля ўваходу ў зал — яблыку не было дзе ўпасці. Атмасферу гістарычнага дзеяння падтрымлівалі, але крыху перабольшвалі музейныя экспанаты — зброя ды адзенне XII стагоддзя.

Выказаць падзяку аўтару прыйшлі і калегі па "гістарычным цэху" (Адам Мальдзіс, Андрэй Кіштымаў і інш.), і супрацоўнікі па кнігавыданні (рэдактары, мастакі), і проста сябры (Уладзімір Арлоў), і нават студэнты...

Трэцяе выданне гісторыі Мінска змянілася не толькі па знешнім выглядзе ды фармаце. Іншым стаў і стыль падання фактаў. Так, упершыню надрукаваная глава аб постаці графа Чапскага ўспрымаецца як частка рамана. А чаго каштуе гісторыя Матроны Марозкінай, апісаная Захарам Васільевічам! Гэтую літаратурную асаблівасць падкрэсліў і пісьменнік Уладзімір Арлоў, адзначыўшы, што "аўтар працуе на мяжы гісторыі і літаратуры, надзелены шчаслівай уласцівасцю распавядаць не толькі цікава, змястоўна, але і пісаць даступна. І гэта дапамагае зрабіць вобразы мінчукоў такімі, што яны былі б вартыя любога мастацкага твора".

У бяседзе з карэспандэнтам "НВ" Захар Шыбека распавёў, што гісторыя стварэння кнігі аб Мінску пачалася яшчэ ў 1972 годзе. "Гэта была тэма маёй дысертацыі. На яе падставе яшчэ ў сярэдзіне 1980-х я выдаў навуковую кніжку, а потым падрыхтаваў першую версію навукова-папулярнага характару". Выданню кнігі дапамог Аддзел культуры Мінгарвыканкама, але тыраж быў паменшаны да трох тысяч экземпляраў. "Калі б я пагадзіўся выдаваць гісторыю Мінска на рускай мове, то тыраж быў бы большым. Толькі я не жадаю вяртацца ў мінулае", — дадаў Захар Шыбека.

Дар'я САЦУКЕВІЧ.
Фота аўтара.

НАУКА

Умеем же!

Белорусские ученые создали медицинский аппарат, который не имеет аналогов в мире.
Он позволит значительно повысить эффективность терапии новорожденных.

Сейчас новорожденный, заболевший желтухой, ежечасно подвергается неприятной процедуре укола. Именно с таким промежутком необходимо отслеживать уровень билирубина в крови. Показатель у больных может быстро измениться. А если содержание билирубина во много раз превышает норму, это оказывает токсическое действие на мозг.

Уникальный аппарат позволит получать точный анализ, не травмируя кожу младенца. Помимо билирубина новый аппарат заодно измерит уровень гемоглобина и меланина. А также определит, сколько должна длиться фототерапия. Пока продолжительность лечебного сеанса врач определяет на глаз. Таких приборов еще нет в мире.

І ТАК БЫВАЕ

Сам папрасіўся ў турму

У Шаркоўшчынскім раёне Віцебскай вобласці адбылося здарэнне амаль па О'Генры.
У мясцовым РАУС прагучаў тэлефонны званок невядомага, які папрасіў: "Забярыце мяне — я абрабаваў краму. Чакаю на прыпынку ў вёсцы Германавічы".

Здзіўленыя міліцыянеры на ўсялякі выпадак выехалі. На прыпынку ўбачылі чалавека, які пацвердзіў, што ён узламаў прадуктовы склеп і скраў некалькі скрыняў віна, каўбасу і цыгарэты. Усім гэтым злодзей гасцінна пачаставаў мясцовых жыхароў. Падчас балявання ён паўтараў, што яму ўсё роўна.

Як высветлілася ў пастарунку, Аляксандру Пяньку няма дзе жыць ды працаваць, і небарака вырашыў лепей сесці за краты, чым загінуць у маразы, паведамляе Радыё "Рацыя".

Прыгавор гора-кіроўцу

Суд Ганцавіцкага раёна разгледзеў незвычайную крымінальную справу: да адказнасці прыцягнуты жыхар вёскі Раздзяловічы, які некалькі месяцаў таму... укусіў за руку інспектара ДАІ.

Здарылася гэта пасля таго, як кіруючы ўласным аўто ў нецвярозым стане мужчына быў затрыманы, а пасля адпраўлены на агляд. Па дарозе ў райцэнтр аўтааматар аказаў супраціў, пусціўшы ў ход зубы. Суд прысудзіў горакіроўцу да трох гадоў пазбаўлення волі (умоўна) з утрыманнем часткі зарплаты ў прыбытак дзяржавы.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

«Народная воля» не здрадзіць...

Не здрадзьце і Вы нам, шаноўныя чытачы. Хочацца, каб у лістападзе нас стала нават болей. Таму звяртаемся да тых, хто пакуль не зрабіў **перадаплату** за бягучы месяц: калі ласка, пастарайцеся вырашыць усе пытанні ў бліжэйшыя дні. Для гэтага ў чарговы раз наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне.

Паўтараем: мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71.

Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за ноябрь, декабрь 2007 г.				
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за ноябрь, декабрь 2007 г.				
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за ноябрь, декабрь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами*** *и* ***обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 31.10.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №